АСПЕКТ ПРАБЛЕМЫ
"БЕЛАВІЯ" Ў НЕБЕ ЕЎРОПЫ 2 стар.

ФЕСТЫВАЛІ
ПАБАЧЫМ ТАЛЕНТЫ ДЫЯСПАРЫ 2 стар.

ДЫПКУР'ЕР
ВЫРАШАЛІСЯ ПРАБЛЕМЫ "ЕЎРАРЭГІЁНА "ДНЕПР" 3 стар.

ЗАПРАШЭННЕ АД «БЕЛІНТУРЫСТА»
НАВЕДАЙЦЕ БЕЛАРУСЬ, КАБ ПАЛЮБАВАЦЦА ЯЕ ПРЫГАЖОСЦЮ! 3 стар.

ЗВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ. ЗША, МАЛДОВА 6 стар.

СПАДЧЫНА
ГІСТАРЫЧНЫЯ МЯСЦІНЫ Ў ФОТАЗДЫМКАХ МАЛАДЫХ 4–5 стар.

СТАСУНКІ
У САНКТ-ПЕЦЯРБУРГУ "ПАЛОВА ОРШЫ ЖЫВЕ" 6 стар.

ЛЁСЫ
РОКАТ І ПЫРСКІ МОРА
ЭСЭ Яўгена ЛЕЦКІ (заканчэнне) 7–8 стар.

КРЫЖАВАНКА АД Любові ЮНАВАЙ 8 стар.

АГУЛЬНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА **РАСПАЎСЮДЖВАЕЦЦА Ў 48 КРАІНАХ**

Голас Радзімы

Штотыднёвая газета для суайчыннікаў за межамі Беларусі **Выдаецца з 6 красавіка 1955 года**

20 лістапада 2003 года, № 47 (2865) Цана 175 рублёў E-mail:golas_radzimy@tut.by

хроніка жыцця

БАБРУЙСКІЯ ШЫНЫ НА РЫНКУ АРГЕНЦІНЫ

Як паведаміў намеснік начальніка аддзела экспарту ААТ "Белшына" Віктар Аляксееў, заключаны кантракт і паступіла перадаплата на партыю шын для сельскагаспадарчай тэхнікі і грузавых аўтамашын. Цяпер гэта прадукцыя рыхтуецца да адгрузкі.

Фота БелТА.

Гэта першы заказ з Аргенціны за апошнія дзесяць гадоў. Акрамя заключэння кантракта, дасягнута дамоўленасць на дапейшае эканамічнае супрацоўніцтва. На бабруйскім прадпрыемстве выпускаецца да 200 тыпаў мадэлей і памераў шын. Палова ўсёй прадукцыі экспартуецца ў 44 краіны.

ПЕРШЫЯ КНІГІ МЕТРЫКІ

Тэарэтычныя і практычныя пытанні выдання кніг Метрыкі Вялікага княства Літоўскага абмяркоўваліся на канферэнцыі ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі.

Па словах загадчыка аддзела спецыяльных гістарычных навук гэтага інстытута доктара гістарычных навук Георгія Галенчанкі, Метрыка старажытнай дзяржавы (кнігі велікакняжацкай канцылярыі) утрымлівае асноўныя рашэнні, дэкрэты, указы вярхоўнай улады і мае першараднае значэнне для вывучэння сацыяльна-эканамічнай, палітычнай і культурнай гісторыі ВКЛ.

Тры кнігі Метрыкі ўжо выйшлі з свет. Яшчэ чатыры чакаюць сваёй чаргі. Выданне ж усяго амаль цудам захаванага унікальнага архіва больш чым з шасцісот кніг, якія знаходзяцца ў Маскве, зойме, лічыць вучоны, не адзін дзесятак гадоў.

АВІЯЛАЙНЕР ДЛЯ МІНІСТРА

Незвычайны заказ атрымаў Мінскі авіярамонтны завод.

Як паведаміў намеснік дырэктара прадпрыемства па камерцыйных і вытворчых пытаннях Алег Манчанка, урад Казахстана прапанаваў заводу пераабсталяваць звычайны штурманскі самалёт Ту-134 у машыну VIP-класа для міністра абароны гэтай краіны. Мінчанам трэба не толькі абсталяваць салон у адпаведнасці з сусветнымі стандартамі, але і надаць лайнеру неабходныя лётныя якасці.

ПАРЛАМЕНТАРЫІ САБРАЛІСЯ Ў БРЭСЦЕ

У Брэсце адбылася сустрэча дэпутацкіх груп па развіцці супрацоўніцтва паміж парламентамі Беларусі і Польшчы.

Былі разгледжаны пытанні двухбаковага супрацоўніцтва ў сферы культуры, развіцця заканадаўчай базы пасля ўвядзення візавага рэжыму, праблемы і перспектывы ўзаемадзеяння па захаванні Белавежскай пушчы, абмеркаваны магчымасці правядзення міжнароднай канферэнцыі па аднаўленні водных транспартных шляхоў з поўначы на поўдзень і іншыя.

ВЫДАДЗЕНЫ ЗБОРНІК ДАКУМЕНТАЎ

Беларускія, нямецкія і аўстрыйскія архівісты падрыхтавалі фундаментальны зборнік дакументаў па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, якія захоўваюцца ў дзяржаўных архівах Беларусі.

Выданне ўяўляе сабой пералік фондаў, калекцый, дакументаў дзяржархіваў нашай краіны, якія ўтрымліваюць інфармацыю па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны з указаннем пошукавых даных і колькасці адзінак захоўвання.

КАНФЕРЭНЦЫЯ Ў МУЗЕІ БАГДАНОВІЧА

8 снежня 2003 года ў Мінску, у Літаратурным музеі М.Багдановіча, адбудзецца Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Я не самотны, я кнігу маю...", прысвечаная 90-годдзю адзінага прыжыццёвага зборніка вершаў М.Багдановіча "Вянок".

Сярод асноўных тэм канферэнцыі: асоба М.Багдановіча ў гісторыі нацыянальнай літаратуры; зборнік "Вянок" — сінтэз нацыянальных і класічных агульнаеўрапейскіх традыцый; фальклорна-міфалагічны каларыт паэзіі М.Багдановіча; творчасць М.Багдановіча ў сусветным кантэксце і іншыя.

Падрыхтавала **Таццяна КУВАРЫНА.**

віншуем

ЁЙ АПЛАДЗІРАВАЛА ЕЎРОПА

10-ГАДОВАЯ ВОЛЬГА САЦЮК З КОБРЫНА БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ ЗАНЯЛА 4-е МЕСЦА НА ПЕРШЫМ ДЗІЦЯЧЫМ КОНКУРСЕ ПЕСНІ "ЕЎРАБАЧАННЕ-2003", ЯКІ ПРАЙШОЎ У КАПЕНГАГЕНЕ (ДАНІЯ)

Гэта захапляючае відовішча транслівалася ў прамым эфіры Першага нацыянальнага тэлеканала, і беларускія гледачы перажылі нямала хвалюючых момантаў.

У спаборніцтве прынялі ўдзел 16 юных выканаўцаў з Беларусі, Харватыі, Латвіі, Польшчы, Македоніі, Румыніі, Швецыі, Вялікабрытаніі, Даніі, Нарвегіі, Іспаніі і іншых краін. Пры аб'яўленні вынікаў конкурсу Вольга Сацюк доўга ўтрымлівала другую пазіцыю, аднак у выніку заняла чацвёртае месца, набраўшы 103 балы. Тройка ж лідэраў выглядае так: Харватыя, Іспанія, Вялікабрытанія.

Як і патрабавалі ўмовы конкурсу, Вольга выконвала твор юнага аўтара. Гэта была песня Каці Ліпоўскай з вёскі Казловічы Слуцкага раёна. Абедзве дзяўчынкі сёлетняй вясной сталі пераможцамі Нацыянальнага тэлеконкурсу юных талентаў "Сузор'е надзей". І абедзве трапілі на "Еўрабачанне". Вольга – спявала, а Кацярына акампаніравала на клавішных.

Другі дзіцячы конкурс песні "Еўрабачанне-2004" адбудзецца ў наступным годзе ў Манчэсцеры (Вялікабрытанія).

падрабязнасці

МІНСКІЯ «ДАЖЫНКІ»

Падвядзенне вынікаў сельскагаспадарчага года ў Мінскай вобласці адбылося ў Сенненскім Доме культуры Мінскага раёна. Тут прайшло абласное свята, прысвечанае Дню работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці аграпрамысловага комплексу і абласныя "Дажынкі-2003".

Пераможцам спаборніцтваў уручаны Дыпломы, Ганаровыя граматы Мінаблвыканкама. Набыў свайго ўладальніка і штогадовы прыз імя камбайнера Юрыя Гельмана, які ўручаецца за самаадданую працу на хлебнай ніве. Яго атрымаў механізатар Генадзь Свірко.

НА ЗДЫМКУ: уладальнік галоўнага прыза Генадзь СВІРКО; гэтыя машыны прызначаны пераможцам "Жніва-2003".

Фота **Аляксандра ТАЛОЧКІ,** БелТА.

у таварыстве "радзіма"

СУСТРЭЧА АДБЫЛАСЯ

З 17 па 22 лістапада ў Мінску праходзіць семінар-стажыроўка кіраўнікоў і ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці беларускіх арганізацый замежжа, наладжаны таварыствам "Радзіма".

Тэарэтычныя заняткі, што праводзяцца навукоўцамі на базе Беларускага інстытута праблем культуры, знаёмяць удзельнікаў семінара з беларускімі звычаямі і абрадамі (Янка Крук), харэаграфічным фальклорам (Мікола Козенка), гульнёвымі праграмамі (Клаўдзія Лабчэўская), перамяжоўваюцца з практычнымі заняткамі ў вядомых беларускіх ансамблях "Церніца", "Валачобнікі", "Вербіца" і іншых.

Пятро Скепка з Польшчы (Гайнаўка), Вікторыя Батрак з Казахстана, Людміла Віткоўская з Літвы, Раіса Жалязоўская і Таццяна Караткевіч з Эстоніі (Нарва), удзельніцы студыі "Алеся" з Таліна (Эстонія), Ларыса Маёрава, Маргарыта Сідарава і Галіна Лехтсаар з цікавасцю і вялікай карысцю для сябе знаёміліся з матэрыяламі Лабараторыі беларускага фальклору БДУ. Новыя звесткі спатрэбяцца ім для папаўнення рэпертуару.

Павел Дзягцярык з Кыргызстана, Галіна Сантоцкая з Латвіі (Даўгаўпілс), Тамара Батрак з Казахстана, Людміла Счаслівенка з Новасібірска, Віктар Гулевіч з Сімферопаля (Украіна, Крым), акрамя асноўнай праграмы семінара, цікавяцца матэрыяламі па навучанні беларускай мове ў нядзельных школах.

Наогул, узаемныя кантакты вельмі карысныя. Несумненна, вучоба ў Мінску дасць добры плён і надоўга запомніцца.

Рэгіна ГАМЗОВІЧ.

РЭКЛАМА

*NEWS FROM BELARUS * БЕЛОРУССКИЕ НОВОСТИ * BIALORUSKIE WIADOMOŚCI * NOTICIAS DE BELARUS * БІЛОРУСЬКІ НОВІНІ *

аспект праблемы

"БЕЛАВІЯ" Ў ЕЎРАПЕЙСКАЙ ПРАСТОРЫ

БЕЛАРУСКАЙ ГРАМАДЗЯНСКАЙ АВІЯЦЫІ – 70 ГАДОЎ

Першы рэйс з мінскага аэрапорта адбыўся ў Маскву. Было гэта ў 1933 годзе. Да таго з Брэста, Гродна, Ліды, іншых гарадоў падымаліся ў неба аэрастаты і дырыжаблі. Цяпер Беларусь мае дзве авіякампаніі, 8 аэрапортаў. Спецыялісты сцвярджаюць, што абласныя аэрапорты, як і сталічныя, адпавядаюць узроўню еўрапейскага класа. На мадэрнізацыю авіяцыйнай тэхнікі, развіццё авіярамонтнага завода, навучанне персаналу штогод выдаткоўваецца 3–4 мільёны долараў ЗША.

Колькасць пасажыраперавозак расце. Калі ў 2002 годзе за дзесяць месяцаў нашым паветраным транспартам карысталіся 5 597, то сёлета ўжо 35 931 чалавек. У мінулым годзе беларускімі авіялініямі выканана 372, а ў 2003 1 530 рэйсаў.

У сувязі ж з новымі міжнароднымі правіламі, якія, у прыватнасці, тычацца шумаў ад самалётаў і прадугледжваюць абмежаванне пералётаў машын расійскай вытворчасці над Еўропай з 2006 года, Беларусь вымушана пераглядзець парк сваіх самалётаў. Як падкрэсліў **Фёдар Іваноў**, старшыня Дзяржаўнага камітэта па авіяцыі Рэспублікі Беларусь, наша краіна – еўрапейская дзяржава, якая мае ўсе падставы прэтэндаваць на карыстанне еўрапейскімі паветранымі шляхамі. Для гэтага робяцца пэўныя крокі. Самы прыкметны — Нацыянальная авіякампанія "Белавія" ўзяла ў аператыўны лізінг 108-месны самалёт "Боінг-737". У замежных навучальных цэнтрах падрыхтавана 5 экіпажаў, 25 бортправаднікоў. Падабраны тэхнічны персанал.

Як сказаў **Анатоль Гусараў**, генеральны дырэктар Нацыянальнай авіякампаніі "Белавія", выкарыстанне самалёта такога класа не толькі дазволіць карыстацца еўрапейскай паветранай прасторай пасля 2006 года, але і з'яўляецца эканамічна выгадным. Да прыкладу, для ажыццяўлення рэйса Мінск—Лондан—Мінск на самалёце Ту-154 неабходна паліва на 15 тон больш, чым на "Боінгу- 737". Такім чынам, эканомія на адным рэйсе складае 5 тысяч долараў ЗША. Гэта сума дазваляе ажыццяўляць лізінгавыя плацяжы. "Белавія", сцвярджае А.Гусараў, імкнецца, каб кошт пералёту гарантаваў якасць сервіса і прадугледжваў шэраг паслуг. Але кошт білета на "Боінг-737" не будзе павышацца. Такім чынам, беларускія авіятары маюць намер адваяваць сваю частку рынку. Існуе праграма закупкі яшчэ некалькіх паветраных суднаў. Так, у 2005 годзе плануецца набыць 50-месны самалёт "Эмбраер", а праз год яшчэ адзін "Боінг".

Мяркуецца выкарыстаць і іншыя спосабы мадэрнізацыі парка самалётаў на Беларусі. Існуе праграма Саюзнай дзяржавы ў гэтай галіне. Ёсць канкрэтныя праекты па абнаўленні, замене рухавікоў на самалётах ТУ, ІЛ, ЯК на Аршанскім авіярамонтным заводзе. І, як засведчыў Ф.Іваноў, Беларусь зацікаўлена ў гэтым, бо нам патрэбны заказы і абноўленыя самалёты.

Галоўнае пытанне, што турбуе кожнага, хто збіраецца ляцець, — бяспека. У гэтым накірунку, запэўніваюць спецыялісты, робіцца ўсё неабходнае. Нядаўна прадпрыемства "Белаэранавігацыя" набыло новую сучасную сістэму кіравання паветраным рухам — "Сінтэз", якая на сённяшні дзень — адна з самых дасканалых. **Уладзімір Нагулевіч**, начальнік упраўлення па бяспецы палётаў Камітэта па авіяцыі, падкрэсліў: з часоў стварэння нацыянальнай авіякампаніі не было ніводнага здарэння з чалавечымі ахвярамі. Штодзень праводзіцца сур'ёзная праца па забеспячэнні бяспекі палётаў.

Алена СПАСЮК.

НА ЗДЫМКАХ: юбілею грамадзянскай авіяцыі Беларусі была прысвечана выстава авіяцыйнай тэхнікі, якая адбылася ў аэрапорце "Мінск-1"; на выставе: ад буйных лайнераў да "малой" авіяцыі.

Фота **Яўгена КАЗЮЛІ.**

грошы

БАНКАМ – ДАВЯРАЮЦЬ

Больш чым на 15 мільярдаў рублёў (або на 1,4 працэнта) павялічыліся ў кастрычніку 2003 года ўклады насельніцтва ў нацыянальнай валюце ў беларускіх банках.

Дэпазіты ў замежнай валюце за мінулы месяц узраслі амаль на 16 мільёнаў долараў ЗША, або на 3,3 працэнта. Станоўчая дынаміка зберажэнняў дасягнута за кошт павелічэння аб'ёмаў пераводных і тэрміновых дэпазітаў. Асабліва яны ўзраслі ў АСБ "Беларусбанк" і ААТ "Белпрамбудбанк". Наогул за 10 месяцаў уклады грамадзян у нацыянальнай валюце папоўніліся на 62,1 працэнта, а ў замежнай — на 27,1 працэнта і склалі адпаведна 1 080 813,5 мільёна рублёў і 496,1 мільёна долараў ЗША.

Росту зберажэнняў у многім садзейнічае працэнтная палітыка Нацыянальнага банка. Яна арыентавана на забеспячэнне абароны ўкладаў грамадзян ад абясцэньвання і даступнасці крэдытаў для рэальнага сектара эканомікі. Нягледзячы на зніжэнне стаўкі рэфінансавання сёлета з 38 да 28 працэнтаў гадавых, працэнтныя стаўкі па ўкладах насельніцтва ў беларускіх рублях па-ранейшаму перавышаюць тэмпы інфляцыі.

Росту ўкладаў садзейнічае і актыўная работа беларускіх банкаў па пашырэнні асартыменту паслуг насельніцтву, павышэнне якасці іх работы.

Канстанцін СЕЛЬСКІ.

гарызонты навукі

КАСМІЧНЫЯ МІНІЯЦЮРЫ МІНСКІХ ФІЗІКАЎ

Расійская міжпланетная станцыя "Марс-Экспрэс", якая ляціць да Чырвонай планеты, нясе ў сабе такое малое аснашчэнне, зробленае вучонымі Інстытута фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, што любая гайка касмічнага апарата важыць значна больш. Тым не менш, па сваім значэнні беларускі ўклад бясцэнны. Размова ідзе аб датчыках сістэмы арыентацыі станцыі і пазіцыянiравання прыбораў, якія будуць вывучаць Марс.

Датчык у касмічным выкананні — усяго толькі міліметровай плошчы пласцінкі, не таўсцейшыя за ліст паперы. Калі ж быць дакладным, такія габарыты мае нават не ён, а герметычны кантэйнер, у якім схавана складанай архітэктуры канструкцыя, сабраная з атамаў рэдказямельных металаў. Каб зрабіць яе здольнай адсочваць нябачныя перамяшчэнні, трэба было распрацаваць асобы састаў металаў, захаваць іх абсалютную чысціню, вытрымаць на атамным узроўні ідэальныя параметры паверхні, тэмпературу ўсіх аперацый кантраляваць з дакладнасцю да сотых долей градуса і многае іншае. Не выпадкова свой выраб вучоныя датчыкам і не называюць. Гавораць: прыбор.

Аднак навошта такі маленькі прыбор? Прычын некалькі. Калі б датчык быў большым, ён каштаваў бы не сотні долараў, а многія тысячы, бо фантастычна дарагія самі матэрыялы. Але гэта не галоўнае. Дзякуючы мікраскапічным памерам, да мінімуму зводзіцца ўплыў цеплавога пашырэння, і прыбор можа працаваць без памылак у дыяпазоне 500 градусаў!

Канструяванне прыбора на атамарным узроўні — залог і яго не пераўзыдзенай нікім дакладнасці. Па гэтай прычыне менавіта беларусам расіяне аддалі прэстыжны заказ, хаця канкурэнтаў хапала. Ды і навошта было мяняць пастаяннага партнёра, у надзейнасці якога канструктары касмічных апаратаў пераканаліся яшчэ з часоў легендарнага "Месяцахода", упершыню аснашчанага беларускімі датчыкамі.

Галіна ВІР.

спорт

САМБА. На першынстве планеты ў Санкт-Пецярбургу беларускія спартсмены заваявалі пяць узнагарод і занялі другую пазіцыю ў агульнакамандным заліку. На вышэйшую прыступку п'едэстала падняўся Юрый Рыбак (да 100 кілаграмаў), "серабро" на рахунку ў Юрыя Сенажацкага (90), а ўладальнікамі "бронзы" сталі Канстанцін Сямёнаў (74), Магамед Абдулганілаў (82) і Леанід Свірыд (+100 кілаграмаў).

СТРАЛЬБА. З дзесяццю ўзнагародамі кантынентальнага форуму (уключаючы камандныя і юніёрскія) вярнуліся беларускія стралкі з Гётэборга. Акрамя гэтага, паспяховыя выступленні Ігара Басінскага, Віталя Бубновіча, Андрэя Васільева і яго цёзкі Казака прынеслі такія неабходныя алімпійскія ліцэнзіі.

НОВЫЯ ПАМЯТНЫЯ МАНЕТЫ. Нацыянальны банк Беларусі выпусціў у абарачэнне памятныя манеты "Вольная барацьба": срэбраную — наміналам 20 рублёў, пробай сплаву 925, тыражом 3 000 штук; медна-нікелевую — наміналам 1 рубель, тыражом 5 000 штук.

У цэнтры манет — выява двух барцоў падчас паядынку на фоне люстэркавага квадрата; унізе — надпіс у два радкі "Вольная барацьба".

Міхаіл МАЗАКОЎ.

падрабязнасці

БЕЛАРУСЬ НА НАВАГОДНІХ ПАШТОЎКАХ

Наўздзіў прыгожыя навагоднія паштоўкі прапануе сёлета выдавецкі цэнтр "Марка" аб'яднання "Белпошта". Яны не толькі зроблены на належным паліграфічным узроўні, але цешаць нацыянальнае пачуццё беларусаў.

На паштоўках прадстаўлена амаль уся наша краіна. Мірскі замак, Жыровіцкі манастыр, таксама выявы царквы-крэпасці ў вёсцы Мураванка Гродзенскай вобласці, касцёла ў Старых Васілішках. Значнае месца займае, канешне ж, Мінск з Траецкім прадмесцем, праспектамі, новым будынкам чыгуначнага вакзала.

Усяго "Марка" прадстаўляе 18 сюжэтаў, зробленых са слайдаў, аўтарамі большасці якіх з'яўляюцца Анатоль Кляшчук і Лолій Македонскі. Гэтыя фатографы супрацоўнічаюць з "Белпоштай" ужо некалькі гадоў. Менавіта яны і пачалі летась серыю навагодніх паштовак з выявамі Мінска. У мінулым годзе сюжэтаў было няшмат, але цікавасць людзей да беларускіх паштовак з роднай тэматыкай была вялікай і скіравала "Марку" на далейшае развіццё ідэі. Кожны сюжэт сёлетніх паштовак выйшаў тыражом 7 тысяч экземпляраў. І, па словах Ірыны Астроўскай, начальніка выдавецкага цэнтра "Марка", сёння беларуская паштоўка карыстаецца найбольшым попытам. Якасныя, цікавыя паштоўкі — спроба прыцягнуць увагу да сябе не толькі старэйшага пакалення, якое традыцыйна карыстаецца яе паслугамі, але і моладзі.

"Марка" супрацоўнічае з многімі беларускімі выдавецтвамі. Навагоднія ж паштоўкі з выявамі беларускай архітэктуры падрыхтавала прыватная фірма "Мой лёс".

Алена СПАСЮК.

фестывалі

ПАБАЧЫМ ТАЛЕНТЫ ДЫЯСПАРЫ

Другі Усебеларускі фестываль народнага мастацтва "Беларусь – мая песня", прысвечаны 60-й гадавіне вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, пачаўся ў нашай краіне і будзе працягвацца да ліпеня 2005 года.

Аргкамітэт фестывалю ўзначаліў намеснік прэм'ер-міністра краіны Уладзімір Дражын. Усе мерапрыемствы будуць ажыццёўлены ў 4 этапы, ахопяць дарослыя і дзіцячыя калектывы, індывідуальных выканаўцаў з усёй Беларусі. На першым этапе з кастрычніка па снежань гэтага года вывучаецца фальклорная спадчына Бацькаўшчыны, творчыя калектывы развучваюць новы рэпертуар і фарміруюць мастацкія праграмы, праводзяцца сельскія агляды па розных жанрах і відах аматарскай творчасці.

Сярод іншых у фестывалі бяруць удзел культурныя суполкі нацыянальных меншасцей нашай краіны, а таксама мастацкія калектывы і асобныя выканаўцы беларускіх суполак замежжа.

Завершыцца фестываль 3–5 ліпеня 2005 года Нацыянальнай выставай народнага мастацтва "Жывыя крыніцы" ў мінскім Палацы мастацтва і гала-канцэртам лаўрэатаў у Палацы Рэспублікі, а затым — Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыяй "Аматарская творчасць XXI стагоддзя: здабыткі, праблемы і перспектывы", якая падвядзе вынікі такога вялікага агляду творчых сіл народнага мастацтва краіны.

Рэгіна ГАМЗОВІЧ.

запрашэнне ®

НАВЕДАЙЦЕ БЕЛАРУСЬ,

каб ПАЛЮБАВАЦЦА яе ПРЫГАЖОСЦЮ!

У Залессі, там, дзе жыў аўтар чароўнага паланеза "Развітанне з радзімай" Міхал Клеафас Агінскі, у верасні 2003 года пад эгідай ЮНЕСКА адбылася Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная адраджэнню і развіццю гістарычных сядзіб. У Беларусі іх, па няпоўных падліках, каля дзвюх тысяч. І многія могуць стаць і ўжо становяцца, як Залессе, значнымі культурнымі асяродкамі, прываблiваюць айчынных і замежных турыстаў. "БЕЛІНТУРЫСТ" мае ў сваёй галіне 48-гадовы вопыт. Але, як гаварылася на канферэнцыі ў Залессі, далёка не ва ўсіх краінах ведаюць, які сервіс мы можам прапанаваць і што сабой уяўляе Беларусь увогуле. У адказ на заўвагі і пажаданні, якія прагучалі ў Залессі, нарадзіўся гэты артыкул. Спадзяемся, што яго ў інфармацыйных мэтах перадрукуюць перыядычныя выданні нашай дыяспары.

Беларусі, безумоўна, неўласцівыя яркія фарбы Паўднёвай Еўропы, экзатычнасць Афрыкі, шматаблічнасць Азіі. Затое яе сціплая прыгажосць прываблівае сваёй пяшчотнасцю, мяккасцю, пастэльнасцю. Яна разлічана на чалавека, духоўна багатага, настроенага рамантычна або сентыментальна-настальгічна.

Беларусь — краіна лясоў і дуброў, пушчаў і балот, тысяч рэк і азёр, бяскрайніх палёў і лугоў, адкрытых цёпламу сонцу або зімнім завеям. Прывабнасць яе — у мяккіх пералівах ранішняга неба над размытай лініяй гарызонта, ап'яняючым паветры сасновага бору, журлівым крыку жураўлёў і сытым рыканні кароў, якія ідуць з пашы. Апусціце стомленыя рукі ў сцюдзёную крыніцу, схаваўшыся ў аксамітнай зеляніне лугавых траў, угледзьцеся ў імклівы лясны струмень, схавайцеся ад грыбнога дажджу пад навесам сялянскай хаты, удыхаючы водар сена і смаляных паленняў. І вы не пашкадуеце, што прыехалі ў Беларусь. Каб адпачыць, паглядзець навокал, павандраваць, папаляваць, парыбачыць. Каб успрыняць яе людзей і яе зямлю як адзінае цэлае.

На нашай зямлі жывуць каля 10 мільёнаў чалавек. Жывуць дружна, без нацыянальных і рэлігійных канфліктаў. Таму садзейнічалі асноўныя рысы беларусаў — працавітасць, талерантнасць у дачыненні да іншых, адсутнасць агрэсіўнасці. Гэтыя рысы ўласцівыя слынным сынам і дочкам зямлі беларускай — як тым, хто тварыў на карысць свайго народа (Ефрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Францішак Скарына, Максім Багдановіч, Янка Купала, Якуб Колас, Уладзімір Караткевіч, Васіль Быкаў), так і тым, хто стаў гордасцю іншых культур (Сімяон Полацкі, Адам Міцкевіч, Ігнат Дамейка, Марк Шагал і многія іншыя). Памятныя мясціны, звязаныя з іх жыццём і дзейнасцю, Вы зможаце агледзець у час падарожжа.

Беларусь — гэта яшчэ і краіна замкаў, храмаў, палацаў, сядзіб, паркаў. Тут, відаць, хаваюцца легендарныя скарбы — у тым ліку 12 радзівілаўскіх апосталаў і маскоўская здабыча Напалеона. На нашай зямлі знаходзяцца Полацк — сталіца адной са старажытнейшых у Еўропе дзяржаў, Полацкага княства, Навагрудак (Навагародак), які стаў першай сталіцай Вялікага княства Літоўскага (750 год назад тут каранавалі Міндоўга). Гэтыя і іншыя гарады і мястэчкі захавалі сярэдневяковую забудову, помнікі архітэктуры: Спаса-Ефрасіннеўскую царкву XI стагоддзя і Сафійскі сабор у Полацку, Каложскую царкву ў Гродне, замкі ў Міры і Нясвіжы, Навагрудку і Крэве, Лідзе і Гальшанах. Адзін пералік помнікаў, гістарычных сядзіб заняў бы некалькі старонак. Усё гэта будзе для Вас даступна ў час падарожжа. Прыгадаем, што ў спісе культурна-гістарычнай спадчыны свету, складзеным ЮНЕСКА, сёння значацца Мірскі замак і унікальная Белавежская пушча, населеная зубрамі, аленямі, дзікамі... Спіс, спадзяемся, будзе папоўнены.

Прыехаўшы ў Беларусь, Вы абавязкова сустрэнеце гасціннасць і прыязнасць, рэдкую ў сённяшнім свеце здольнасць з разуменнем і павагай адносіцца да чужых звычак. Тут Вас пачастуюць традыцыйнымі баршчом і халадніком, мачанкай і верашчакай, бульбай у гаршчэчках і вэнджанымі вуграмі, кісялём і квасам, а калі Вы трапіце ў Дудуткі пад Мінскам — то яшчэ і самагонам.

У Беларусі Вам можа здацца, што тут, у сэрцы Еўропы, час запаволіў свой прыспешаны бег. Прырода тут застаецца натуральнай, людзі — чалавечнымі, а каштоўнасці — вечнымі. Гэта асабліва Вам кінецца ў вочы на фоне глабалізацыі, якая паскорана робіць жыццё стандартным.

Ну а калі Вы беларус, прадстаўнік той чвэрці ўсіх беларусаў, якія пражываюць за межамі сваёй краіны, калі Вы рускі, паляк, яўрэй, татарын, літовец, але адначасова ўраджэнец Беларусі ці нашчадак ураджэнцаў, то Вы зможаце наведаць родныя мясціны, пакланіцца зямлі сваіх продкаў, асэнсаваць свае карэнні, скласці (з дапамогай архівістаў) свой радавод.

"БЕЛІНТУРЫСТ", Нацыянальны турыстычны канцэрн Рэспублікі Беларусь, будзе рады магчымасці пазнаёміцца з Вамі і здзейсніць Вашу мару — наведаць сваю радзіму. Галоўная мэта нашай дзейнасці — рэалізацыя задум і інтарэсаў кожнага падарожніка, турыста, які хоча адкрыць Беларусь з новага, не бачанага раней, нечаканага боку. Якія б ні былі Вашы мэты — адукацыйныя, пазнавальныя, культуралагічныя, спартыўныя, паляўнічыя ці дзелавыя, — мы заўсёды дапаможам Вам арганізаваць і правесці патрэбныя сустрэчы, атрымаць асалоду ад непаўторнай прыроды, карысна, цікава і весела правесці час. Якасць нашых паслуг праверана і знакамітымі кліентамі, і шматлікімі аматарамі падарожжаў.

Сёння "БЕЛІНТУРЫСТ" адраджае і развівае даўнюю традыцыю наведвання Беларусі ў адпаведнасці з веравызнаннем кожнага госця — праваслаўнага ці каталіка, іудзея ці мусульманіна. Наша шматканфесійная і талерантная краіна ганарыцца матэрыяльнымі помнікамі і духоўнай спадчынай кожнага веравызнання, якое здаўна прыжылося на нашай зямлі.

Мы перакананы, што наша краіна з непаўторнай прыродай, старажытнай матэрыяльнай і духоўнай спадчынай, гасціннымі і добрасардэчнымі людзьмі з'яўляецца якраз тым месцам на зямлі, якое Вам варта наведаць.

"БЕЛІНТУРЫСТ" працуе на міжнародным турыстычным рынку і заўсёды гатовы дапамагчы Вам наведаць нашу непаўторную краіну — Беларусь.

Марыя ФІЛІПОВІЧ,
генеральны дырэктар
Нацыянальнага турыстычнага
канцэрна "Белінтурыст".

BELINTOURIST
National Tourist Travel Holding Company

Рэспубліка Беларусь, 220004, Мінск, праспект Машэрава, 19.
Тэлефоны: (+375 17) 226 97 00, 223 34 21, 223 72 55, 226 98 61, 226 99 71, 226 98 40.
Факс: (+375 17) 223 11 43.
E-mail: ugene@belintourist.by.
Web: www.belintourist.by.

Працяг тэмы на 4–5-й стар.

дыпкур'ер

ПАСОЛ БЕЛАРУСІ СУСТРЭЎСЯ З ПРЭЗІДЭНТАМ АКАДЭМІІ НАВУК МАЛДОВЫ

Адбылася сустрэча пасла Беларусі ў Малдове Васіля Саковіча з прэзідэнтам Акадэміі навук Рэспублікі Малдова Андрэем Андрыешам.

Бакі абмеркавалі ход двухбаковага супрацоўніцтва ў сферы навукі. Асобая ўвага была нададзена плануемым Акадэміяй навук Рэспублікі Малдова і Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі сумесным мерапрыемствам на 2004 год, у тым ліку і міжнародным навукова-практычным канферэнцыям з удзелам абедзвюх краін.

У ходзе сустрэчы адзначана, што найбольш актыўна развіваецца супрацоўніцтва паміж навукова-вытворчым аб'яднаннем "Парумбень" Акадэміі навук Малдовы і Беларускім НДІ земляробства і кармоў па выпрабаванні гібрыдаў кукурузы малдаўскай і беларуска-малдаўскай селекцыі (гібрыды канкуруюць з лепшымі аналагамі вядучых замежных фірм). У плане пашырэння двухбаковага супрацоўніцтва падкрэслена важнасць актывізацыі сумесных даследаванняў па селекцыі, экалагічным і вытворчым выпрабаванні з мэтай стварэння больш канкурэнтаздольных гібрыдаў кукурузы для Рэспублікі Беларусь, якія забяспечваюць атрыманне высокіх і стабільных ураджаяў збожжа.

АДБЫЛАСЯ МІЖНАРОДНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ "ЕЎРАРЭГІЁН "ДНЕПР"

У Чарнігаве (Украіна) прайшла Міжнародная канферэнцыя "Еўрарэгіён "Днепр" – праблемы развіцця і функцыяніравання".

Дэлегацыі Беларусі, Расіі і Украіны прадставілі прыгранічныя Гомельскую, Бранскую і Чарнігаўскую вобласці, якія ўзначальвалі губернатары і старшыні абласных Саветаў. У канферэнцыі прынялі ўдзел Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ва Украіне Валянцін Вялічка і прадстаўнікі дыпламатычных місій Расіі ва Украіне, Украіны — у Расіі і Беларусі.

У ходзе канферэнцыі прайшлі пасяджэнні тэматычных секцый па пытаннях развіцця інфраструктуры Еўрарэгіёна "Днепр", міжрэгіянальнага супрацоўніцтва ў сферы эканомікі, бізнесу, фінансаў, экалогіі, навукі, адукацыі і культуры.

Згодна з дасягнутымі ў рамках Еўрарэгіёна "Днепр" дамоўленасцямі, адбылася цырымонія афіцыйнага адкрыцця прадстаўніцтва Гомельскай гандлёва-прамысловай палаты ў Чарнігаве, мэта яе дзейнасці — пашырэнне і паглыбленне міжрэгіянальнага эканамічнага супрацоўніцтва.

Па выніках сустрэчы падпісаны зварот да выканаўчых органаў Асацыяцыі еўрапейскіх прыгранічных рэгіёнаў наконт уступлення Еўрарэгіёна "Днепр" у гэтую арганізацыю ў якасці паўнапраўнага члена.

Прэс-служба МЗС.

шматгалоссе

ДЗЕНЬ НАРОДНАГА СМУТКУ-2003

У Дзень народнага смутку, які прыпадае на лістапад, немцы ўшаноўваюць памяць ахвяр войнаў і тыраніі.

Супрацоўнікі Пасольства ФРГ у Мінску і іншыя немцы, якія пражываюць у Беларусі, у гэты дзень таксама ўшанавалі памяць ахвяр войнаў і тыраніі ў Беларусі. Былі ўскладзены вянкі да помніка Перамогі на плошчы Перамогі, у Курапатах, да мемарыяла ахвяр яўрэйскага гета ў Мінску "Яма", на салдацкіх могілках у Тарасаве.

Канстанцін СЕЛЬСКІ.

РАМАЗАН-БАЙРАМ

Беларускія татары разам з усімі вернікамі-мусульманамі свету адзначаюць адно з сваіх вялікіх свят – Рамазан-Байрам, якое сведчыць аб сканчэнні вялікага посту на працягу 30 дзён у месяц рамазан.

У гэтыя дні вернікі ісламу трымаюць перад Алахам справаздачу аб добрасумленным выкананні абавязкаў за ўсе дні посту (Уразы).

Свята Ід аль-Фітр адзначаецца асобым урачыстым Салятам (малітвай), наведваннем мусульман, прывітаннямі, падарункамі, клопатамі і турботамі аб родных і блізкіх, старых і нямоглых, бедных людзях. З асаблівай нецярплівасцю чакаюць гэтае свята дзеці, бо для іх гатуюцца арыгінальныя стравы (часцей салодкія) і рыхтуюцца добрыя падарункі.

Мусульмане маюць і абавязкі перад сваёй абшчынай, таму ў Рамазан-Байрам уносяць асобы падатак — «закят аль-фітр» за пост у рамазан-месяц.

У традыцыі з далёкіх гадоў у гэтыя дні і наведванне мізараў (татарскіх могілак), казанні і ўспаміны пра свае радавыя карані.

Ібрагім КАНАПАЦКІ.

мінск, захарава, 28. дом дружбы

ФРАНЦУЗСКІЯ ДАБРАЧЫНЦЫ

Дабрачынная гуманітарная асацыяцыя "Аліса" з Францыі – даўні сябар Беларускага Дома дружбы – днямі даставіла ў нашу краіну чарговы канвой з медыцынскім грузам.

Як адзначыў у размове намеснік старшыні Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі Анатоль Шынкевіч, гэта ўжо 25-я дабрачынная акцыя вядомай французскай арганізацыі. Яе прадстаўнікі прывезлі медыкаменты і медыцынскія прыналежнасці. Увесь груз размеркаваны паміж раённымі бальніцамі Рэчыцы і Лагойска, 9-й бальніцай і 2-й дзіцячай бальніцай Мінска.

Калі раней у Беларусь прыязджалі актывісты "Алісы" пераважна сярэдняга ўзросту, то цяпер да іх далучылася і моладзь.

сітуацыя

Фота БелТА.

НА ВЯСЕЛЛЕ – У ШАТЛАНДСКАЙ СПАДНІЦЫ

Незвычайнае вяселле маглі назіраць віцяблянe і госці абласнога цэнтра. Да гарадскога Палаца шлюбаў пад'ехалі машыны, з якіх выйшлі жаніх і яго родзічы, апранутыя ў кілты (традыцыйныя шатландскія спадніцы). Шатландзец Рос Джэймс Хагерт узяў шлюб з віцяблянкай Ксеніяй Шпакоўскай. А пазнаёміўся Рос з Ксеніяй у Шатландыі, куды студэнтка Гродзенскага аграрнага універсітэта прыехала некалькі гадоў таму на практыку.

НАМ ЁСЦЬ ЧЫМ ГАНАРЫЦЦА!

Ствараючы мастацкі фотапраект «Спадчына Беларусі», мы імкнемся як мага шырэй паказаць культурнае багацце нашай краіны. Знаходжанне паміж Захадам і Усходам дазволіла Беларусі стаць месцам перапляцення зусім розных культур. Асабліва яскрава гэта вызначылася ў архітэктуры. Многія храмы, палацы, замкі або сядзібы ўвасобілі ў сабе адначасова адценні ўсходнерускіх і заходнееўрапейскіх стыляў і традыцый. Некаторыя з іх уяўляюць сабой выключныя па значнасці архітэктурныя знаходкі. Мяркуйце самі...

Святая Ефрасіння Полацкая – сімвал нашага праекта. Гэта яе вобраз у дэкоры разнога іканастаса XVIII стагоддзя Свята-Сімяонаўскай царквы ў горадзе Камянцы. [Фота 1].

Свята-Мікалаеўскі сабор (XVII стагоддзе) у Магілёве. У ім знаходзіцца адзін з трох вядомых у свеце разных залатых іканастасаў, аналагі якому ёсць толькі ў Смаленску і Маскве. [Фота 5, 6].



Спаса-Ефрасіннеўская царква (XII стагоддзе) у Полацку – адзін з першых помнікаў старажытнай Русі з новымі архітэктурнымі формамі, якія сталі ў XII стагоддзі характэрнымі для ўсяго рускага дойлідства. Яе ўнутраныя фрэскавыя размалёўкі XII стагоддзя - унікальны твор старажытнарускага манументальнага мастацтва сусветнай значнасці. [Фота 11, 12].

Касцёл Прасвятой Тройцы (XIX стагоддзе) у вёсцы Індура - яскравы помнік ампіру з раскошным інтэр'ерам. [Фота 2, 3, 4]

Касцёл Св. Станіслава (XVIII стагоддзе) у Магілёве – выдатны помнік сумяшчэння барока, ракако і класіцызму. Яго інтэр'ер упрыгожаны адным з найбольш разгорнутых на Беларусі фрэскавых біблейскіх цыклаў. Адзін з іх – «Уручэнне ключоў апосталу Пятру». [Фота 13, 14].

Наогул, жывапіс Беларусі – незвычайная з'ява ў еўрапейскім мастацтве. Паралельнае існаванне іканапісу, алтарнай карціны і свецкага жывапісу не мае аналогій у мастацтве іншых краін. У Беларусі свая унікальная школа іканапісу і фрэскавай размалёўкі. Напрыклад, вельмі прыгожыя абразы "Маці Божай з дзіцем" у касцёле Праабражэння Гасподняга ў вёсцы Новая Мыш [фота 7], які з'яўляецца цудатворным, і ў касцёле Прасвятой Тройцы ў вёсцы Дунілавічы. [Фота 8].

Палацавы ансамбль Булгакаў (XIX стагоддзе) у Жылічах – цудоўны помнік класіцызму, славуты сваім дэкорам столей з сапраўдным залатым роспісам. [Фота 9, 10].



Аднак гістарычная спадчына Беларусі напоўнена не толькі багаццем духоўнага, але і свецкага жыцця. Напрыклад, род князёў Радзівілаў быў найбагацейшым у Еўропе, Гродна – рэзідэнцыя польскіх каралёў, а ў Белавежскай пушчы гаспадарылі расійскія імператары. Вельмі шкада, што на практыцы большасць беларусаў ведае толькі замкі ў Нясвіжы і Міры, калі мы маем таксама і іншыя не менш значныя помнікі.



Палац-сядзіба генерал-лейтэнанта Гатоўскага (XIX стагоддзе) у Чырвоным Беразе. Унікальны помнік сумяшчэння абсалютна розных стылей архітэктуры. Толькі ў знешнім выглядзе выкарыстаны элементы готыкі, класіцызму і цераннага будаўніцтва. Акрамя гэтага, кожная зала ўнутранага інтэр'ера ўпрыгожана ў розных стылях: арабскім, англійскім, італьянскім і іншых. [Фота 15, 16, 17, 18].



Жывапісная сядзіба (XIX стагоддзе) сусветна вядомага мастака І. Рэпіна ў Здраўневе, дзе ён стварыў каля 40 карцін і малюнкаў. [Фота 19, 20, 21].

Важнай асаблівасцю Беларусі стала распаўсюджванне на яе тэрыторыі магдэбургскага права. Тады ж пачалі ўзводзіцца і ратушы, адна з якіх знаходзіцца ў Шклове. [Фота 22, 23].



Беларусь сапраўды мае багатую культурную скарбніцу. У гэтым можна ўпэўніцца, вандруючы па нашай краіне. Многія з помнікаў знаходзяцца ў цэнтры гарадоў і вёсак, як Свята-Дабравешчанская царква (XII стагоддзе) ў Віцебску [фота 24], Свята-Раства-Багародзіцкая царква-крэпасць (XVI стагоддзе) у вёсцы Мураванка [фота 25], Свята-Пакроўская царква (XIX стагоддзе) у вёсцы Асінагарадок [фота 26], камень-крыж у Шклове [фота 27], палац у вёсцы Прылукі [фота 28] і іншыя. Усе гэтыя скарбы побач, толькі трэба прыгледзецца.

А калі вы хочаце за адзін раз пазнаёміцца з помнікамі розных куткоў Беларусі, то мы рады вітаць вас на нашых фотавыставах.

Аляксандр АЛЯКСЕЕЎ, Алег ЛУКАШЭВІЧ *[фота 29].*





зваротная сувязь

ЗША. ЧЫКАГА

НА ПАМЯЦЬ АЗДОБЫ НА ЯЛІНКУ

Дарагая спадарыня Салук, 30-га жніўня да нас у Чыкага завітаў Юрый Гарбінскі і перадаў мне ад Вас прывітанне, а таксама вершы ад Іны Снарскай, прысвечаныя мне і майму мужу Вітаўту. Гэта была сапраўды вялікая і нечаканая неспадзеўка для мяне. Букет кветак з саломкі вельмі прыгожы і заняў пачэснае месца ў нашым доме, а вершы спадарыні Снарскай мы прачыталі з вялікай цікавасцю і задавальненнем. Дай Бог, абедзвюм вам добрага здароўя на доўгія гады служыць нашым гаротным беларускім людзям, дзе б яны ні жылі.

Спадар Гарбінскі правёў у Чыкага больш за тыдзень, і мы з ім бачыліся амаль кожны дзень. Ён шукае матэрыял пра беларускія цэрквы ў замежжы для сваёй кніжкі. Вельмі цікавы і інтэлігентны навуковец. Былі рады сустрэцца і пазнаёміцца з ім.



Дарэчы, наша грэка-каталіцкая царква Хрыста Збавіцеля перастала існаваць 20-га ліпеня з-за недахопу парафіян. Людзі, якія арганізавалі царкву ў 1955 годзе, ужо састарэліся і адыходзяць у лепшы свет, а моладзь амаль уся параз'язджалася па розных гарадах Амерыкі ў пошуках лепшай працы і лепшых умоў жыцця.

Высылаю вам на памяць аздобы на ялінку, якія мы скарыстоўвалі ў музеі з 1918 да 2000 года. Гэта толькі невялікая частка іх. Наша ялінка заўсёды была вышынёй $5^1/_2$ метра.

Вось як пачыналі мы рабіць першыя аздобы на нашу беларускую ялінку для Музея навукі і індустрыі ў Чыкага.

Гэтыя дзве формы зрабіла мая мама, Еўдакія Жызнеўская. Пасля спадарыня Люня (Людвіка) Будчанка прыпомніла, як рабіла такія аздобы ў беларускай гімназіі ў Вільні. Яна сцвярджала, што ніколі раней яны не атрымліваліся такімі прыгожымі. "Гэта проста цуд, нібы сам Бог падказваў, як рабіць", — казала яна. Кожная саломкавая аздоба, а таксама нарыхтоўка скрыначак з беларускімі ўзорамі ці фрагментамі займалі ў яе 5–10 гадзін. Усяго яна зрабіла больш як 300 рэчаў, укладваючы душу ў іх. Кіраўніцтва музея казала, што наша ялінка найпрыгажэйшая па форме і каларыту і вельмі падабалася наведвальнікам музея.

Дык яшчэ раз шчырае вам дзякуй за такі цудоўны падарунак і памяць пра мяне. Прывітанне вам ад мяне і майго мужа Вітаўта.

З глыбокай пашанай да вас

Вера РАМУК.

АД РЭДАКЦЫІ. *Шаноўная спадарыня Вера Рамук! Атрымалі ад Вас вестку і цудоўныя аздобы, што зрабілі беларускія жанчыны ў ЗША. Вельмі крануў гэты падарунак. Абавязкова знойдзем яму вартае прымяненне і паведамім аб гэтым Вам.*

Прывітанне ўсім сябрам нашай газеты. Найлепшыя пажаданні Вашаму сямейству.

МАЛДОВА

СУСТРЭЧА СЯБРОЎ

Дэпартамент міжэтнічных адносін і беларуская абшчына горада Кішынёва нядаўна прымалі госця з Мінска – Уладзіміра Скарынкіна. Сёлета споўнілася тры гады, як была падпісана дамова аб супрацоўніцтве паміж таварыствамі Малдова – Беларусь (узначальвае заслужаная артыстка Малдовы М.Іванушу) і Беларусь – Малдова (узначальвае паэт, лаўрэат прэміі імя Янкі Купалы У.Скарынкін).

З гэтай нагоды правялі пасяджэнне, але яно не было афіцыйным па настроі: прайшло без справаздач. Адбылася шчырая сяброўская размова пра тое, што яшчэ трэба зрабіць, каб было цікава працаваць і жыць.

Выступіла М.Іванушу і расказала пра справы таварыства Малдова—Беларусь. Старшыня Славянскага фонду пісьменства і культуры І.Васільеў праінфармаваў прысутных аб укладзе прадстаўнікоў беларускай абшчыны ў культуру Малдовы, аб праведзеных сумесных мерапрыемствах. М.Мунцян, народны артыст СССР, згадаў, як раней прадстаўляў таварыства "Дружба" за мяжой. Зараз іншы час, адзначыў ён, і жыццё паказала, што перш за ўсё мацуецца яднанне на ўзроўні культур.

У сустрэчы прынялі ўдзел дырэктар Дэпартамента міжэтнічных адносін Малдовы Т.Млечка і пасол Беларусі В.Саковіч.

Падчас пасяджэння было падпісана новае двухбаковае пагадненне.

Затым Уладзімір Скарынкін прадставіў першы том Анталогіі вершаў лепшых паэтаў Малдовы ў перакладзе на беларускую мову. Раней выходзілі кнігі вершаў беларускіх паэтаў на малдаўскай мове, а вось на беларускай — гэта першая. Вершы малдаўскіх паэтаў пераклалі Р.Барадулін, Ю.Свірка, Л.Дайнека, А.Вольскі, Р.Баравікова, У.Скарынкін і іншыя вядомыя беларускія паэты.

У круглай зале дэпартамента доўга гучалі вершы на беларускай і малдаўскай мовах.

Вячаслаў ІГНАЦЕНКА.

стасункі

ПОЛЬШЧА

ВЫДАДЗЕНА МАНАГРАФІЯ "СВЯТЫЯ ЗЯМЛІ БЕЛАРУСКАЙ"

Выдавецтва Варшаўскай праваслаўнай мітраполіі пры садзейнічанні Пасольства Беларусі ў Польшчы выпусціла манаграфію "Святыя зямлі беларускай".

Кніга, якая выдадзена на польскай мове, мае папулярны характар і дае магчымасць шырокаму колу польскіх чытачоў лепш пазнаёміцца з багатай гістарычнай, культурнай і рэлігійнай спадчынай беларускага народа.

Выданне ўключае звесткі больш як пра сорак праваслаўных святых, жыццё і дзейнасць якіх звязана з беларускай зямлёй. Побач з такімі вядомымі постацямі, як Ефрасіння Полацкая, Кірыл Тураўскі, Сімяон Полацкі, манаграфія прадстаўляе беларускіх святых, якія былі кананізаваны ў апошні час.

Як лічаць аўтары, асаблівую вартасць выданне будзе мець для этнічных беларусаў у Польшчы, перш за ўсё моладзі, бо знаёмства з дзейнасцю святых зямлі беларускай спрыяе фарміраванню і ўмацаванню нацыянальнай і духоўнай свядомасці.

Фінансавую дапамогу ў выданні манаграфіі аказала ААТ "Прыорбанк".

ФРГ

КАРЦІНЫ БЕЛАРУСКІХ МАСТАКОЎ ДЛЯ НЯМЕЦКІХ КАЛЕКЦЫЯНЕРАЎ

38 лістапада па 14 снежня 2003 года ў горадзе Ліх (федэральная зямля Гесен, ФРГ) праходзіць чацвёртая выстава-продаж карцін беларускіх мастакоў.

Выстава арганізавана царкоўнай абшчынай Гунген-Вілінген/Ноненрот, якая на працягу 13 гадоў актыўна супрацоўнічае з Беларуссю ў гуманітарнай сферы. На выставе 159 карцін. Даход, атрыманы ад іх продажу, будзе накіраваны на закупку медыцынскага абсталявання і лекаў для пацярпелых ад чарнобыльскай катастрофы.

Падрыхтавала **Галіна ВІР.**

ТАМ ПАЛОВА ОРШЫ ЖЫВЕ...

Свае 300-я ўгодкі ўрачыста адзначыў сёлета адзін з найпрыгажэйшых гарадоў свету Санкт-Пецярбург. Пра сувязі паўночнай сталіцы Расіі з Беларуссю можна распавядаць доўга і шмат. Мая ж задача больш сціплая: паказаць сувязь Пецярбурга з Оршай, дакладней, Оршы з Пецярбургам.

Для загалоўка пазычыў словы свайго земляка Уладзіміра Караткевіча з ліста, накіраванага ім увесну 1958 года універсітэцкаму таварышу, кіяўляніну Міхаілу Гальдштэйну. Працуючы ў той час настаўнікам у Оршы, малады пісьменнік марыў пасля заканчэння цяжкага навучальнага года наведаць Ленінград. *"Лета будзе вольным. А потым магу і ў Піцер з вамі паехаць, – піша У.Караткевіч, – спыніцца там ёсць дзе: трэба будзе праз цётку Жэню спісацца з яе знаёмымі. А не дык не, там палова Оршы жыве. Будзем там жыраваць жыццём колькі ўлезе, думаю, што лепшае ў горадзе ты мне пакажаш".* (Пераклад з рускай мовы з дазволу Аршанскага музея Уладзіміра Караткевіча друкуецца ўпершыню). І ўсё ж такі, відаць, будучы класік беларускай літаратуры так ні разу і не наведаў паўночную Пальміру.

Зразумела, палова Оршы ў Піцеры — мастацкае перабольшванне, але сустракаюцца ў сучасным Санкт-Пецярбургу беларусы не так ужо і рэдка: з 5,5 мільёна гараджан беларусаў амаль 100 тысяч. Пра аршанцаў сярод іх — крыху ніжэй.

Спачатку пра гістарычныя сувязі Пецярбурга і Оршы, якая, дарэчы, у тры разы старэйшая за юбіляра. Па-першае, сам заснавальнік горада на Няве Пётр Вялікі быў нашчадкам аршанскага баярына Андрэя Кабылы. Па-другое, будаўніцтвам заснаванага ў маі 1703 года Санкт-Пецярбурга непасрэдна кіраваў Аляксандр Меншыкаў, які таксама меў беларускія карані. Аляксандр Пушкін, які глыбока вывучаў пятроўскую эпоху, згадвае, што А.Меншыкаў "адшукваў каля Оршы свой радавы маёнтак". І ўжо дакладна вядома, што ў 1709 годзе "счастья баловень безродный" дамогся ад польскага караля і вялікага князя Літоўскага Аўгуста II перадачы яму Аршанскага староства. А ў 1715 годзе купіў мястэчка Дуброўна (і гэта было не адзіным яго набыткам на Беларусі). Не выпадкова, што ў поўным тытуле А.Меншыкава чытаем: "...губернатар Санкт-Пецярбургскі, староста Аршанскі..." А калі ўжо згадваць аршанскія карані "птенцов гнезда Петрова", нельга не назваць імя віцэ-канцлера, барона Пятра ШАФІРАВА. Яго бацька, Павел ШАПІРА, быў аршанскім яўрэем, які ў XVII стагоддзі перасяліўся ў Маскоўскую дзяржаву. Дарэчы, яго сын стаў першым "выхадцам з яўрэяў", якія дасягнулі высокіх дзяржаўных пасад у манархічнай Расіі.

У першай палове XIX стагоддзя Санкт-Пецярбург і Оршу злучыла шасейная дарога. Накіроўваючыся на поўдзень, праз Оршу праязджалі многія выдатныя дзеячы расійскай культуры. Сярод іх і Аляксандр Пушкін, які быў у Оршы двойчы: у 1820 годзе, калі накіроўваўся ў паўднёвую ссылку, і ў 1824 годзе, калі вяртаўся з яе. Галоўная вуліца Оршы ўжо ў пачатку XIX стагоддзя атрымала назву Пецярбургскай (цяпер гэта вуліца Леніна), бо выходзіла на пецярбургскі паштовы тракт. Праўда, у Оршы не было і няма вуліцы Ленінградскай, як у Піцеры няма Аршанскай. Тым не менш, беларуская тэматыка ў тапаніміцы паўночнай сталіцы Расіі прысутнічае. Больш за ўсіх "адзначаны" Віцебск: ёсць Віцебскі вакзал, Віцебскі праспект і вуліца. Акрамя гэтага — Беларуская вуліца, Брэсцкі бульвар, вуліцы Касцюшкі і Канстанціна Заслонава.

Чыгунка злучыла Пецярбург і Оршу ў 1902 годзе. Тады ж Орша стала вузлавой станцыяй, найбуйнейшай не толькі ў Беларусі, але і ва ўсёй Расійскай імперыі. Паказальна, што менавіта ў Оршы пецярбуржцы робяць цяпер перасадку на цягнікі, якія ідуць у заходнім накірунку. Маючы ў сваім распараджэнні некалькі гадзін вольнага часу, яны, відаць, ужо натэтычна валодаючы прыроджанай інтэлігентнасцю, звычайна выкарыстоўваюць іх для знаёмства з помнікамі старажытнага горада на Дняпры, наведваюць яго музеі.

Як вядома, Пецярбург валодае найбагацейшымі скарбніцамі гістарычных рэліквій і культурных каштоўнасцей усіх часоў і народаў. Маюцца ў горадзе на Няве і аршанскія рарытэты. Напрыклад, у Дзяржаўнай публічнай бібліятэцы ёсць унікальныя выданні славутай Куцеінскай друкарні XVII стагоддзя. А ў Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве захоўваюцца шматлікія дакументы XVIII — пачатку XX стагоддзя, якія тычацца гісторыі Оршы і наваколля.

Але час прыгадаць найбольш знакамітых аршанцаў.

Карэнным піцерцам ужо даўно стаў выдатны фізік Барыс Захарчэня. А з'явіўся на свет будучы вучоны ў 1928 годзе ў Оршы (у пасведчанні аб нараджэнні горад яшчэ названы Воршай). Уся яго працоўная біяграфія звязана з Фізіка-тэхнічным інстытутам імя Іофэ, дзе ён плённа працуе і цяпер. Б.Захарчэня — акадэмік Расійскай АН, лаўрэат Ленінскай і Дзяржаўных прэмій. А яшчэ ён шматгадовы калега і блізкі сябра нобелеўскага лаўрэата Жарэса Алфёрава (таксама, дарэчы, ураджэнца Віцебшчыны). Застаецца дадаць, што ў 1998 годзе імем Захарчэні была названа адна з малых планет Сонечнай сістэмы.

Зоркамі першай велічыні спорту з'яўляюцца цяперашнія піцерцы, ураджэнцы Оршы Сяргей Каплякоў, плывец, алімпійскі чэмпіён, і Антаніна Лангіна (Захарава), чэмпіёнка свету па рускіх шашках.

Сярод ураджэнцаў Оршы — пецярбуржцаў — выкладчыкі і бізнесмены, мастакі і медыкі, ваенныя і дзяржаўныя служачыя.

Зусім нядаўна Орша ўстанавіла партнёрскія сувязі з Чырвонагвардзейскім раёнам Санкт-Пецярбурга (відаць, і таму, што намеснік кіраўніка адміністрацыі і начальнік упраўлення культуры — нашы землякі). У святочнай культурнай праграме, прысвечанай юбілею, з вялікім поспехам выступаў у Піцеры вядомы далёка за межамі Оршы калектыў — дзіцячы ўзорны харэаграфічны ансамбль "Весялушкі".

Віктар ЛЮТЫНСКІ *(г.Орша).*

падпіска-2004

БУДЗЕМ РАЗАМ!

Нагадваем, што атрыманне газеты "Голас Радзімы" можна аплаціць чэкам на прад'яўніка – рэдакцыя газеты "Голас Радзімы", даслаўшы ЧЭК у рэдакцыю па пошце на адрас:

220005, Рэспубліка Беларусь, Мінск, пр.Ф.Скарыны, 44. Рэдакцыя газеты «Голас Радзімы».

Кошт гадавой падпіскі на "Голас Радзімы":

– у ЗША, КАНАДЗЕ, АЎСТРАЛІІ, АРГЕНЦІНЕ і іншых краінах далёкага замежжа – 60 долараў ЗША,

– краінах ЕЎРОПЫ – 50 долараў ЗША.

лёсы

РОКАТ І ПЫРСКІ МОРА

ЭСЭ



Ёсць людзі, якія жыццё пражываюць, так і не задумаўшыся над тым, што абазначае запіс у пашпарце пра нацыянальную прыналежнасць.

Сказаць дакладна, калі ён адчуў сябе беларусам, Валера наўрад ці б здолеў. Але ў адным пэўны: прышчапілася ад маці. Не, гэта не была нейкая навука ці мудрасць, а хутчэй, неўсвядомленыя на той момант імпульсы, якія, зернейка за зернейкам, адкладваліся ў яго маладой хлапечай натуры, спакваля там набрыньвалі жыццядайнай сілай, каб пры спрыяльным надвор'і прарасці кволымі ці дужэйшымі парасткамі.

А ў маці ішло гэта ад сустрэчы ў раннім юнацтве з, як яго тады называлі, усебеларускім старастам Алесем Чарвяковым. Нават не ведала, як яго звацьвелічаць, бо пры той гаворцы ў вясковай хаце-чытальні госць адразу ж адмахнуўся ад усякага тытулавання і папрасіў называць яго проста дзядзька Алесь. І гаварыў ён з людзьмі без усякага мудравання і выкрунтасаў — проста, зразумела і шчыра. І хоць сам Чарвякоў у гэтай мясціне больш не паказваўся і нічым пра сябе не нагадваў, але і ў сваёй непрысутнасці тут быў прысутным, як тое сонейка ўвесну на зацягнутым хмарным полагам небе...

Аж датуль згадвалі яго добрым словам і "разам з ім" хадзілі да начальства, пакуль не пачало тварыцца на гэтай зямлі для людзей штосьці няўцямнае. Нібы перакуліўся свет дагары нагамі. Пачалася барацьба з "ворагамі народа". І адным з самых зламысных сярод іх выявіўся Аляксандр Рыгоравіч Чарвякоў...

Імя яго зрабілі забароненым для згадвання, і сам ён спакваля пачаў сцірацца з людской памяці. Але не з Ганулінай. І тут, як гэта ні дзіўна, вызначальнай была не тая сустрэча з ім у хаце-чытальні і не яго прамова з яе вынікамі, а, здавалася б, зусім дробнае здарэнне.

Яны, дзеці, першымі павыскоквалі на двор і гурбой акружылі такі рэдкі тады самаходлегкавушку. Расступіліся, далі шаноўнаму госцю праход. І ён ужо быў узяўся за ручку, каб адчыніць дзверцы, ды позірк яго раптоўна запыніўся на дзяўчынцы. Па-бацькоўску прыязна ўсміхнуўся, паклаў сваю шырокую далонь на русявую галоўку Ганначкі, прыгарнуў да грудзей: "Будзь, дзяўчынка, стараннай, слухайся тату з мамай і вучыся ім на радасць. А шчасце тваё цябе не абміне!"

На зямлі шмат чаго мянялася, адгрукацела вайна, а Ганну не пакідала адчуванне цяпла дарослай рукі. Яна закончыла ўсяго сем класаў, бо трэба было дапамагаць маці ў працы, якая засталася адна: бацьку паднялі ноччу з пасцелі ў сподніках і больш не вярнулі.

Але заўсёды згадвала, што вучылася ў БСШ № 8, а калі хто няўцямна перапытваў, што гэта такое, то тлумачыла, што закончыла беларускую школу, дзе ўсё было беларускае: і падручнікі, і ўсе надпісы ў школе, і вучні з настаўнікамі гаварылі толькі па-беларуску. У тую самую, толькі ўжо без нумара, а пад назвай Новамільчанская сярэдняя школа, хадзіў і Валера. На першым часе яна таксама лічылася беларускай, хоць пра гэта мала хто і ведаў: усе прадметы, за выключэннем беларускай мовы і літаратуры, гісторыі БССР ды геаграфіі, выкладаліся па-руску. А неяк , каб аблегчыць вучням жыццё, на агульным сходзе прапанавалі прынесці заявы аб вызваленні ад вывучэння роднай мовы.

Валерык пасля школы прыбег дахаты і пра ўсё расказаў маме.

— Дурненькі ты мой! — прыгарнула яго да сябе. — Тут плакаць трэба, а не радавацца. Разумнаму, сынок, свая мова лішняй не будзе.

Тая восень, калі ён асталяваўся жыць у Латвіі, была, няйначай, падорана людзям самім Госпадам Богам і на прасвятленне душ у бягучы момант жыцця, каб было што ўспамінаць потым, калі сядзіш у хаце, бо на дварэ азызлая слата, і праз слязлівыя шыбы атупела пазіраеш у хмарную каламуць...

А пакуль што стаяў на зямлі жоўта-залацісты з ядранымі начамі, што прадракалі блізкія прымаразкі, і цёплымі, нават спякотнымі ўдзень гадзінамі верасень. Ноччу пасярод усыпанага калючымі зорамі неба качалася поўня, а ўдзень раскашавала сляпучае сонца, спакваля адбіраючы ў дрэў і кустоў зеляніну, пазалочваючы лісце клёнаў, букаў і ясеняў, пакрываючы жаўцізною бярозавае голле. Ды найбольш вабіла Валеру да сябе дзічка, якая расла непадалёку ад іх хаты, але ў іншую пару года і не была надта прыкметнай сярод вечназялёных хвояў. А потым неяк раптоўна запунсавела-запалымнела яркай і такой вабнатрапяткой пад лёгкім ветрыкам чырванню...

Вабіць — вабіла, цешыць вока і душы — цешыла, але ўвабраць у сябе і ўжо знутры перадаць, увасобіць гэты цуд фарбай Валеру так і не ўдалося. Некалькі дзён спрабаваў-падступаўся, але ўрэшце зняверыўся і пачаў злаваць на сваю нямогласць, а на дзічку і зусім стараўся не глядзець, бо ўжо нічога, апрача раздражнення, яна ў яго не выклікала. Пагадзіўся: не наканавана ёй, як той дзяўчыне, быць яго каханкай, бо яна не яго. Мо прычына была ў тым, што ён маляваў акварэлі,

дзе ўвасаблялі настрой паўтоны, свой адмысловы свет ствараўся, дзякуючы мяккасці і лірызму колераў. А тут, у гэтай яркай сярод сцішанай зеляніны чырвані, праглядвалася штосьці экспрэсіўна-выбуховае, якое патрабавала адпаведнага ўвасаблення, дынамічных мазкоў, што могуць класціся на палатно пэндзлем, а яшчэ лепш пальцамі, якія перадаюць нервовасць, трапятлівасць успрыняцця.

Зрэшты, можа проста не той у яго быў тады настрой. Нядаўна пажаніліся з Лідай, ён атабарыўся ў сваім куце і ў радаснапрасветленым натхненні маляваў да самазабыцця, перадаючы ў акварэлях тое, што яму тады найбольш імпанавала. А дзічка тая назаўсёды засталася сярод юрмальскіх хвояў, як нейкае здзейсненае прароцтва таго, што потым на іх абрынецца драматычным паваротам жыццёвага лёсу...

Валера маляваў пейзаж, на якім праз пазалочанае лісце клёна праглядваўся блакіт неба. Ад нечаканасці здрыгануўся. Ускінуў здзіўленыя вочы ўгару — хоць бы хмурынка. Нібы адчуўшы спінаю — азірнуўся. За некалькі крокаў ад яго стаяў высакарослы мужчына — адна рука з адтапыранымі пальцамі ў кішэні, а другая неяк фацэтна ўперлася ў бакавіну, з-за чаго стан набыў своеасаблі-ва-гумарыстычны абрыс. Адкрыты твар свяціўся шчырай прыязнай усмешкай.

— Не палохайцеся, маэстра! — адметным па тэмбру голасам праракатаў ён. — Я не з органаў, я сам па сабе...

— Ды не! Чаго тут палохацца! — нібы апраўдваючыся, прамовіў Валера. — Я во, ведаеце, падумаў, што гэта ад аблачыны мяне цень агарнуў, адно ж гэта вы!.. — дакончыў неяк ніякавата.

— Ах, ха-ха-ха! — нечакана гучным гарлавым смехам зарагатаў мужчына. — Гэта здорава: воблака ў штанах! — рука завіравала ў кішэні і ўздыбіла-адтапырыла калашыну. — З воблакам мяне ніхто не зблытваў! А ўвогуле, будзем знаёмы! — ужо паважна закончыў ён і працягнуў на знаёмства руку. — Уладзімір!

— Валера!

— Можа быць і Валера. Бо галоўнае не гэта, а тое, што тут. І што мы намалюкалі? Ну што ж, маэстра, — пацешна пакруціў галавой, неяк раптоўна ўзварушыўся, захадзіў вакол мальберта. — А ведаеш, няблага. Зусім нават няблага... Але, слухай, я нават і не сцяміў адразу — мы ж з табою лясы-балясы вядзем па-беларуску. Дык, выходзіць, ты з Дому творчасці мастакоў з Дзінтары... Даўно прыехаў? Але, выбачай, — шырока развёў рукамі, — як гэта ты міма мяне праляцеў, што я цябе ў Мінску з вока спусціў? Ці ты не са сталіцы, а з перыферыі? Так званай перыферыі. Але што не з Віцебска, то дакладна: я там усіх гаўрыкаў ведаю... Тады адкуль? Хм. А ўвогуле цікава-цікава. Нешта ў тваёй манеры нетутэйшае... Дык прызнавайся: адкуль будзеш?

— Не ў Беларусі я, а тут во, у Дзінтары, жыву, у сваім уласным доме.

— П-ф-ф-ы... — як паравоз выдыхнуў з сябе мужчына. — Гэта ціка-ва... Дык якім жа ветрам цябе, уюнаша, сюды занясло?

— Марскім ветрам. Служыў на флоце, потым тут у акадэміі вучыўся, а потым і на стала прышвартаваўся...

— А ведаеш, што такіх, як ты, беларусаў па ўсім свеце каля чатырох мільёнаў раскідана. Не меней, чым усіх латышоў разам...

— Няўжо? — шчыра здзівіўся Валера. — У Рызе я ўсяго некалькіх, трох ці чатырох, ведаю. А то аж чатыры мільёны... Няўжо?

— Што ты як дзяцел? Няўжо ды няўжо! Беларусаў тых, няйначай, трэба пад мікраскопам адшукваць. Гэта ж не ўкраінцы! А нашы! Ты хоць адну беларускую песню ведаеш?

— Заканчэнне на 8-й стар. —

НА ЗДЫМКАХ: В.ДЗЕВІСКІБА на адкрыцці выставы; карціны мастака "Лясное вока" і "Рыбны порт".

Заканчэнне. Пачатак у №№ 45, 46.

у будучы даведнік

СУАЙЧЫННІКІ Ў СВЕЦЕ

Уладзімір КІРКЕВІЧ

Кіркевіч Уладзімір Міхайлавіч (21.05.1938, Сярэдняя Азія), інжынер, мастак, педагог, грамадскі дзеяч беларускай дыяспары ва Украіне.

У.Кіркевіч нарадзіўся ў беларускай сям'і і адчувае сябе беларусам. Яго дзяцінства прайшло ў Пінску Брэсцкай вобласці. Там ён скончыў школу, потым гідрамеліярацыйны тэхнікум (1956). Адначасова вучыўся акварэльнаму жывапісу і малюнку. Любоў да выяўленчага мастацтва разам з сакрэтамі работы акварэллю перадаў яму Яўген Пулхаў. Пасля заканчэння тэхнікума Кіркевіч вучыўся ў Кіеўскім гідрамеліярацыйным інстытуце (1956—1961). З 1961 года, атрымаўшы дыплом інжынера-гідратэхніка, пераехаў у Крым, на будаўніцтва Паўночна-Крымскага канала, дзе працаваў на працягу дваццаці гадоў. З 1969 года жыве ў Феадосіі (Крым).

Увесь вольны час У. Кіркевіч аддаваў акварэльнаму жывапісу: пісаў эцюды з натуры, наведваў выставы і музеі, вывучаў кнігі па мастацтву, прымаў актыўны ўдзел у навуковых канферэнцыях. З 1991 года цалкам прысвяціў сябе творчай працы, вучыў акварэльнаму жывапісу школьнікаў. З 1992 года вядзе мастацкі гурток "Акварэль". У тым жа годзе У. Кіркевіч завочна скончыў факультэт жывапісу і графікі Маскоўскага універсітэта мастацтва. Вельмі актыўна працуе ў тэхніцы камернай акварэлі. Адбылося больш чым сто асабістых выстаў мастака. Як лічыць ён сам, найбольш ганаровыя для яго былі ў час святкавання 150-годдзя з дня нараджэння І.Рэпіна ў жніўні 1994 года (г. Чугуеў); у ліпені 1996 года ў Віцебску падчас правядзення V Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар"; у верасні 1997 года ў Пінску ў гонар 900-годдзя горада і ў Кіеве (кастрычнік, 1997). У Музеі сучаснага мастацтва (чэрвень, 1998) у сувязі з 60-годдзем мастака адбылася першая мінская выстава нашага суайчынніка "Украіна ў акварэлях У. М. Кіркевіча", на якой было прадстаўлена 38 аўтарскіх работ. Выстава мела вялікі поспех. Працягам яе стала выстава пад назвай "Беларусь", якая адбылася ў Мінску ў канцы сакавіка 2003 года. У.Кіркевіч прысвяціў каля трохсот акварэлей роднай Беларусі. 35 аўтарскіх работ з выставы "Беларусь" ён падараваў Цэнтру імя Ф.Скарыны. Каля тысячы яго акварэлей захоўваецца ў фондах музеяў Украіны, Беларусі, Расіі і іншых краін (у тым ліку ў фондах 38 музеяў Беларусі — звыш 200 акварэлей). У.Кіркевіч выдаў "Дапаможнік для пачынаючых мастакоў" (Сімферопаль, 2003).

Наш суайчыннік актыўна ўдзельнічае ў культурным жыцці беларускай дыяспары Украіны.

Наталля ТАКТАСУНАВА (Мінск).

*NEWS FROM BELARUS * БЕЛОРУССКИЕ НОВОСТИ * BIALORUSKIE WIADOMOŚCI * NOTICIAS DE BELARUS * БІЛОРУСЬКІ НОВІНІ *

інтэграцыя

АБАРАНЯЮЦЬ ЗАКОНЫ

Мінскае выдавецтва "Беларусь" выпусціла невялікім тыражом кнігу "Беларусь – Расія. Наш агульны дом". Думаю, што ёю зацікавяцца многія нашы чытачы, бо тут друкуюцца нарматыўныя прававыя акты, якія рэгулююць правы грамадзян Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі.

Як піша ва ўступным слове Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі Уладзімір Грыгор'еў, "гэты зборнік можа служыць практычным дапаможнікам для грамадзян Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі, органаў дзяржаўнай улады дзвюх дзяржаў".

І сапраўды, кожны грамадзянін Беларусі, які паехаў у Расію на заробкі ці ў госці, можа трапіць у непрадказальную сітуацыю, напрыклад, захварэць. Як, хто і на якіх умовах акажа яму медыцынскую дапамогу? Аб гэтым можна атрымаць падрабязную інфармацыю на старонках 150–162, дзе гаворыцца, што хуткую і неадкладную дапамогу пры раптоўных захворваннях, якія пагражаюць жыццю хворага ці небяспечныя для здароўя іншых, няшчасных выпадках і г.д. грамадзяне дзяржаў Садружнасці могуць атрымаць бесперашкодна, бясплатна для пацыента і ў неабходным аб'ёме ва ўсіх лячэбна-прафілактычных установах дзяржавы часовага знаходжання грамадзян (незалежна ад наяўнасці медыцынскага страхавога паліса).

На старонках зборніка можна таксама знайсці адказы і на пытанні аб дазволе на часовае пражыванне, абмене жылых памяшканняў, атрыманні адукацыі і многія іншыя, з якімі даводзіцца сутыкацца ў паўсядзённым жыцці за мяжой.

Дарэчы, Пастаянны камітэт Саюзнай дзяржавы сумесна з Пасольствам Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь рыхтуе выпуск аналагічнага выдання, у якім будуць асветлены пытанні прававога забеспячэння расійскіх грамадзян на тэрыторыі Беларусі.

Таццяна КУВАРЫНА.

стасункі

ЭКАНАМІЧНЫЯ АДНОСІНЫ ПАМІЖ БЕЛАРУССЮ І ЗША РАЗВІВАЮЦЦА

Эканамічныя адносіны паміж Беларуссю і ЗША апошнім часам развіваюцца на даволі добрым узроўні. У нас склаліся пазітыўныя адносіны ў бізнесе. У Беларусі налічваецца 500 сумесных прадпрыемстваў з амерыканскім капіталам. У сувязі з гэтым Беларусь гатова да далейшага пашырэння канструктыўнага дыялога са Злучанымі Штатамі Амерыкі. Аб гэтым заявіў выконваючы абавязкі прэм'ер-міністра Беларусі Сяргей Сідорскі, прымаючы 19 лістапада ў Доме ўрада Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла ЗША ў Беларусі Джорджа Крола.

Сяргей Сідорскі выказаў упэўненасць, што гэта сустрэча паслужыць далейшаму ўмацаванню эканамічных сувязей паміж дзвюма дзяржавамі. Ён таксама падзякаваў ураду ЗША за тое, што ў студзені 2003 года быў падпісаны мемарандум, які рэгулюе пытанні гандлю беларускім тэкстылем. В.а. прэм'ер-міністра падкрэсліў, што Беларусь улічвае ўплыў еўрапейскага і сусветнага рынку і прыкладвае вялікія намаганні для павышэння канкурэнтаздольнасці сваёй эканомікі. Амерыканскія спажыўцы змаглі ў гэтым пераканацца, купляючы беларускую сталеліцейную прадукцыю, шкловалакно, тэкстыль.

Сяргей Сідорскі таксама праінфармаваў пасла аб тым, што цяпер Беларусь займае вядучае месца сярод краін СНД па тэмпах эканамічнага развіцця, узроўні жыцця. У 2003 годзе вызначылася ўстойлівае павелічэнне вытворчасці ўнутранага прадукту, рост якога за першае паўгоддзе склаў 5 працэнтаў, за 9 месяцаў — 6 працэнтаў, за 10 месяцаў — 6,5 працэнта. Чакаецца, што па выніках года будуць атрыманы добрыя паказчыкі эканамічнага развіцця. Аб'ём знешнегандлёвага тавараабароту павінен дасягнуць 15 мільярдаў долараў. Выконваючы абавязкі прэм'ер-міністра таксама падкрэсліў: "Мы будзем вітаць усе вашы намеры садзейнічаць таму, каб амерыканскі капітал адчуваў сябе ўпэўнена ў Беларусі".

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол ЗША ў Беларусі Джордж Крол падзякаваў за сустрэчу і адзначыў, што яна першая з кіраўніком беларускага ўрада. Пасол сказаў, што ў Беларусі ён трэці раз, таму паездзіў па нашай краіне, сустракаўся з прадстаўнікамі ўрадавых і няўрадавых арганізацый. Работа ў Беларусі, лічыць Джордж Крол, дасць магчымасць больш даведацца пра эканамічнае, палітычнае і сацыяльнае развіццё краіны. Нядаўні візіт у Гродна таксама даў магчымасць лепш пазнаёміцца з Беларуссю. Пасол выказаў сваё разуменне тых праблем, якія даводзіцца пераадольваць беларускай эканоміцы ў "перыяд трансфармацыі і пасля распаду СССР". Пры гэтым ён падкрэсліў, што бачыць жаданне ўрада і народа краіны працягваць рэформы ў эканамічнай сферы. Ён таксама заявіў, што ЗША "могуць садзейнічаць інтэграцыі Беларусі ў агульную эканамічную прастору". Джордж Крол адзначыў "жаданне ЗША будаваць далейшыя адносіны з Беларуссю".

На думку пасла, аб'ём інвесціравання амерыканскага капіталу ў беларускую эканоміку, які складае каля 100 мільёнаў долараў, нязначны ў параўнанні з іншымі краінамі. Тут ёсць вялікі патэнцыял для развіцця, улічваючы геапалітычнае становішча Беларусі і "менталітэт беларусаў", падкрэсліў амерыканскі пасол.

Лілія КРАПІВІНА, БелТА.

ад першай асобы

Іліе ВАНЧА, *Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Рэспублікі Малдова:*

БЕЛАРУСЬ – ЦУДОЎНАЯ КРАІНА: ТУТ МАЛЯЎНІЧАЯ ПРЫРОДА, ДОБРАЗЫЧЛІВЫЯ ЛЮДЗІ І ВЫДАТНЫЯ ДАРОГІ...

19 лістапада споўнілася 11 гадоў, як былі ўстаноўлены пасля распаду СССР дыпламатычныя адносіны паміж Беларуссю і Малдовай. З нагоды гэтай падзеі Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Малдовы ў Рэспубліцы Беларусі Іліе Ванча адказаў на пытанні нашай газеты.



ДАВЕДКА: Іліе Ванча нарадзіўся 26 студзеня 1949 года ў вёсцы Кышліца-Прут Вулканешцкага раёна Рэспублікі Малдова. Закончыў Кішынёўскі дзяржаўны універсітэт па спецыяльнасці настаўнік гісторыі і сацыялогіі. З 1998 па 2002 год быў дэпутатам Парламента Рэспублікі Малдова, дзе выконваў абавязкі намесніка старшыні камісіі па культуры, навуцы, адукацыі і СМІ, з 2000 па 2002 год - міністр адукацыі РМ, а з мая 2002 года – Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Малдова ў Беларусі, Літве, Латвіі, Эстоніі, а таксама Пастаянны і Паўнамоцны прадстаўнік Рэспублікі Малдова пры статутных і іншых органах СНД.

– Спадар Ванча, вы ўжо паспелі пазнаёміцца з краінай і людзьмі, якія ў вас уражанні?

— Здаецца, прыехаў нядаўна, але прайшло ўжо паўтара года: шмат работы, таму час бяжыць хутка. Пра Беларусь многа добрага чуў яшчэ са школьных гадоў, а ў лістападзе 2000 года ў якасці назіральніка ад малдаўскага парламента быў на выбарах у Нацыянальны сход Беларусі. Ужо тады мяне краіна зацікавіла, але грунтоўна пазнаёміўся з ёю ў апошні час. Паспеў пабываць ва ўсіх абласных цэнтрах. Беларусь — цудоўная краіна: тут прыгожая прырода, маляўнічыя лясы і азёры, уражваюць дарогі еўрапейскага ўзроўню, па якіх я паспеў парадкам пакалясіць. Усюды я меў зносіны з гараджанамі і вяскоўцамі, сустракаўся з высокапастаўленымі чыноўнікамі і з простымі працаўнікамі і хачу сказаць: людзі ўсюды ў вас цудоўныя.

Хацеў бы яшчэ адзначыць, што ў Беларусі беражліва адносяцца да свайго мінулага. Тут шмат гістарычных мясцін: я паспеў пабываць у адрэстаўрыраваным Мірскім замку, у старажытным Полацку, у Брэсцкай крэпасці, у Хатыні, пазнаёміўся амаль з усімі значнымі гістарычнымі помнікамі. Для мяне, як гісторыка, гэтыя паездкі ўяўляюць вялікую каштоўнасць. Вельмі падабаюцца вашы культурныя мерапрыемствы: фестываль нацыянальных культур у Гродне, міжнародны фестываль мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску", свята песні "Залаты шлягер", што нядаўна чарговы раз прайшоў у Магілёве. Ва ўсіх гэтых святах удзельнічаюць і малдаване.

– Як складваецца навуковае, культурнае, гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Малдовай?

— За 11 гадоў паміж нашымі краінамі заключана каля 70 дагавораў, пагадненняў, прыняты шэраг пастаноў на ўзроўні ўрадаў, міністэрстваў, што складае салідную прававую базу для супрацоўніцтва. Самыя значныя з тых, што прыняты ў гэтым годзе: пагадненне аб супрацоўніцтве па забеспячэнні правоў асоб, якія належаць да нацыянальных меншасцей. Гэта пытанне вельмі важнае для Малдовы, дзе каля 30 працэнтаў насельніцтва — нацыянальныя меншасці. У маі пагадненне аб супрацоўніцтве падпісалі міністры абароны нашых краін, а таксама Акадэміі навук, інфармацыйныя агенцтвы БЕЛТА і МАЛДПРЭС.

Тавараабарот паміж нашымі краінамі складае штогод каля 80 мільёнаў амерыканскіх долараў, а сёлета, відаць, будзе каля 90 мільёнаў. Кожны год міжурадавая малдаўска-беларуская камісія прымае рашэнне аб пастаўцы з Малдовы 50 тысяч тон гародніны і садавіны. І яно заўсёды выконваецца. З Беларусі ў Малдову накіроўваюцца трактары. У гэтым годзе ўжо атрымана 400 трактароў, да канца года будзе адпраўлена яшчэ 100. На наступны год плануем закупіць каля 1 000 трактароў. Яны вельмі патрэбны Малдове для апрацоўкі зямлі. Акрамя таго, закупляем тралейбусы, карыстаюцца попытам вашы халадзільнікі, тэлевізары, будаўнічыя матэрыялы, мінеральныя ўдабрэнні, нафтапрадукты, трыкатаж...

Як для Беларусі, так і для Малдовы было б неразумна губляць абжытыя рынкі збыту.

– Якія новыя праекты супрацоўніцтва распрацоўваюцца ў апошні час?

— Для патрэб сельскай гаспадаркі Беларусі ў мінулым годзе было закуплена ў Малдове каля 12 тысяч тон насення кукурузы. Таму абмяркоўваецца праект па стварэнні сумеснага прадпрыемства па вырошчванні насення кукурузы. Уся каньячная прамысловасць працуе ў асноўным на малдаўскай сыравіне. Разглядаецца пытанне стварэння сумеснага прадпрыемства па вырошчванні і перапрацоўцы вінаграду. Добра, калі Беларусь зможа праінвесціраваць гэты праект.

– Спадар пасол, як складваюцца вашы адносіны з малдаўскай дыяспарай у Беларусі? Як, на ваш погляд, жывуць малдаване ў Беларусі і ці часта звяртаюцца па дапамогу ў пасольства?

— Дыяспара наша – адна з самых вялікіх у Беларусі. Так, па перапісу насельніцтва 1999 года, тут пражывае каля 4 тысяч малдаван, у асноўным у Мінску. У вашай краіне яны аказаліся па розных прычынах: хтосьці тут служыў, ды так і застаўся, хтосьці ажаніўся ці выйшаў замуж. Практычна ўсе добра ўладкаваны. Ёсць малдаване, якія займаюць у Беларусі даволі высокае становішча. Напрыклад, Пётр Рагажэўскі — намеснік міністра абароны Беларусі, шмат у беларускай арміі афіцэраў-малдаван. Адзін з іх, палкоўнік Георгій Пушкаш, працуе ў ваенным шпіталі. Ён да таго ж актыўны ўдзельнік усіх мерапрыемстваў, якія праводзяцца "Абшчынай "Малдова", паэт. Антаніна Валько — дырэктар вялікай аптэкі, старшыня абшчыны...

Наша дыяспара актыўна ўдзельнічае ў такіх мерапрыемствах, як фестывалі нацыянальных культур, Дні горада. Нядаўна праводзіўся гарадскі фестываль нацыянальных культур. Было прыемна паглядзець на нашых самадзейных артыстаў. У іх цудоўная праграма. Выступалі яны ў новых касцюмах, якія пры нашым садзейнічанні прыслаў з Кішынёва Дэпартамент міжэт-